## Практыкаванне 8

**Прачытайце сказы, выдзяляючы лагічным націскам розныя члены сказаў. Задайце пытанні да кожнага варыянта прачытаных сказаў.**

1.Учора мы ездзілі на выставу выцінанкі.
2.Я перагледзеў фільм свайго дзяцінства.
3.Алена запісала рэцэпт пірага з капустай.
4.Праз месяц сустрэнемся ў бабулі.
5.Дзяўчаты нашага класа падрыхтавалі прэзентацыю для семінара па беларускай літаратуры.

## Практыкаванне 9

**Прачытайце тэкст. Падбярыце назву ў адпаведнасці з асноўнай думкай. Вызначце тыпы сказаў паводле мэты выказвання і інтанацыі.**

Ці ведаеце вы пра ліхтаршчыка[сл] і газавыя ліхтары на вуліцы Савецкай у Брэсце? У любую пару года па вечарах на гэтай вуліцы збіраюцца турысты з фотаапаратамі і ганяюцца ад ліхтара да ліхтара за легендарнай гарадской асобай — ліхтаршчыкам Віктарам Кірысюком. Ён запальвае газавыя ліхтары. Ёсць на вуліцы Савецкай нават спецыяльны[м] гадзіннік. Ён паказвае час з'яўлення ліхтаршчыка! Сярод славутасцей сучаснага Брэста значыцца Алея каваных ліхтароў. Кожны ліхтар на ёй — гэта адметны арт-аб'ект, са сваёй ідэяй і задумкай. Ініцыятарам устаноўкі мастацкіх ліхтароў (іх амаль 50) стаў вядомы брэсцкі скульптар і каваль Аляксандр Чумакоў. Многія са скульптур вырабіў ён сам. Ліхтары вельмі розныя — з глобусам, мальбертам, ліхтар-пажарнік, ліхтар-каваль, ліхтар — чысцільшчык абутку, ёсць нават ліхтар-карэта. Прагуляйцеся вечарам па Алеі каваных ліхтароў. Ад прагулкі сярод іскрыстых «ліхтарных» скульптур з'яўляюцца надзвычайны настрой і невымоўнае адчуванне! *(Паводле А. Цярэнцьевай).*

**Раскрыйце значэнні слоў *ініцыятар, каваль.***


Правообладатель Национальный институт образования